## Народная гісторыя назвы рэк, паселішчаў і ўрочышчаў раёна.

У нашым раёне мясцовасць надзвычай гарыстая. Літаральна па ўсёй тэрыторыі між пагоркаў размясціліся вёскі, асабліва каля маленькіх рачушак і азярынаў. Да сярэдзіны ХХ стагоддзя можна было бачыць багатыя памесці, ці панскія двары. Сёння такіх сядзібаў практычна не засталося і толькі ў памяці старэйшых жыхароў захоўваюцца назвы мясцінаў, што непасрэдна звязаны з прозвішчамі і імёнамі колішніх гаспадароў. Па раёну засталося мноства тапанамікаў назвы якіх і сёння дапамагаюць арыентавацца на мясцовасці.

У першай палове XIII стагоддзя тэрыторыя сучаснага раёна ўваходзіла ў склад Наваградскага княства, а з сярэдзіны стагоддзя князь Міндоўг пачаў праводзіць актыўную палітыку аб'яднання зямель левабярэжнага Нёмана ў новую дзяржаву, якая пазней атрымала назву Вялікага Княства Літоўскага. Спачатку ў межах дзяржавы існавалі балцкая і славянская этнічныя супольнасці. Адсюль назвы рэчак, маюць балцкае паходжанне (Неўда, Сэрвач, Уша), а большасць паселішчаў маюць славянскія карані (Турэц, Беразавец, Асташын, Лукі, Краснае, Заполле, Любанічы і інш.). У гэтым жа стагоддзі адбылася каланізацыя зямель плямёнамі дрыгавічамі і крывічамі. Побач з вёскамі і гарадзішчамі карэннага балцкага насельніцтва ўзнікаюць славянскія паселішчы. Першае паведамленне ў пісьмовых крыніцах тычыцца Турца і датуецца 1276 годам.

На працягу XIII - XIV стагоддзяў адбываліся войны паміж ВКЛ, Галіцка - Валынскай Руссю, Польскім каралеўствам і Тэўтонскім ордэнам. У 1394 годзе адбыўся апошні паход крыжакоў на Наваградак, а ў 1395 годе іх шлях праходзіў праз Карэлічы і Мір, аб гэтым сведчаць першыя пісьмовыя ўпамінанні пра Мір і Карэлічы. У XV стагоддзі ў далінах Нёмана, яго прытокаў Ушы, Сэрвачы, а таксама рэк Неўды, Руткі, Агнешы, Зямчаткі, Міранкі, Змейкі, Пятухоўкі і іншых з'яўляюцца сёлы, двары і замкі. У пісьмовых крыніцах упершыню згадваюцца паселішчы Лукі, Цэрын, Жухавічы, Асташын, Паланая, Малюцічы. У другой палавіне XV стагоддзя

згадваецца Цэрынская воласць. У пачатку XVI стагоддзя згадваюцца Раманы, Скорава, Працяневічы, Некрашэвічы, Барацін, Кальчычы, Стрэльнікі.

У XVI - XVIII стагоддзях перыяды мірнага развіцця чаргаваліся са спусташальнымі нападамі іншаземных захопнікаў. У пачатку XVI стагоддзя Мір, Карэлічы і іх ваколіцы былі разрабаваны татарамі. У сярэдзіне XVII стагоддзя ў час войнаў з Рэччу Паспалітай і Швецыяй многія населеныя пункты былі разбураны. У пачатку XVIII стагоддзя, у гады Паўночнай вайны, шведы зноў спалілі Карэлічы, Мір і некаторыя фальваркі і сёлы.

Вярхоўнымі ўласнікамі зямель з'яўляліся вялікія князі літоўскія. Пры Вітаўце, яго братах Жыгімонце і Казіміры Ягайлавічу назіраецца працэс раздачы дзяржаўных зямель свецкім і духоўным феадалам, у выніку чаго шляхецкае землеўладанне становіцца пераважаючым. Вітаўт перадаў Наваградскаму касцёлу сяло Лукі. Вялікі князь Жыгімонт перадае двор Мір Сеньку Гедыголдавічу. Пан Мікалай Няміравіч атрымаў ад вялікага князя двор Жухавічы. Сяло Малюцічы было пажалавана вялікім князем Казімірам Свірылю, а сяло Тупалы было ім жа аддадзена татарам, спачатку Ісупу, а пасля Сяіцю з сынам. У першай палове XVI стагоддзяў найбольш буйнымі землеўладальнікамі з'яўляліся князі Чартарыйскія, Іллінічы і Храптовічы, а ў другой палове XVI - XVIII сттагоддзяў большая частка зямель у межах сучаснага раёна належала Радзівілам і Хадкевічам. Асобнымі сёламі валодалі прадстаўнікі сярэдняй і дробнай шляхты. У пачатку XVI стагоддзя Фёдар Калантай атрымаў ад вялікага князя Аляксандра двор Паланая з сёламі Барацін, Стрэльнікі, Працяневічы, Кальчычы. У дакументах XVI стагоддзя ў ліку землеўладальнікаў называюцца татарскія князі Васіль Мунча (Некрашэвічы) і Ахмет Улан (Малюцічы). Побач з маёнткамі феадалаў доўгі час захоўваліся і дзяржаўныя землі, якімі валодала Цэрынскае староства.

Асноўным тыпам населеных пунктаў у XIV - XVIII стагоддзях з'яўляюцца сёлы. Да сярэдзіны XVI стагоддзя яны ўяўлялі сабой паасобку размешчаныя адзін ад аднаго двары (дымы), сялянскія надзелы, як і іх двары, былі размешчаны бязладна. Іх засялялі сяляне, а таксама прадстаўнікі

ваеннаслужылага насельніцтва баяры і зямяне. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення ў сярэдзіне другой паловы XVI стагоддзя зямельнай рэформы (валочная памера) сітуацыя мяняецца, асобна размешчаныя сялянскія двары зліваліся ў адно кампактнае вулічнае паселішча, за якім былі замацаваны тры полі. У новых паселішчах на адным баку вуліцы знаходзіліся жылыя дамы і некаторыя гаспадарчыя пабудовы (клець, хлеў, павець), а насупраць, цераз вуліцу стаялі сялянскія гумны. Асноўная частка сёл адносілася да невялікіх ці сярэдніх па памерах паселішчаў. У 1646 годзе ў маёнтку Карэлічы вялікай колькасцю двароў (каля 135) вылучалася сяло Слабада, звыш 70 двароў было ў сяле Заполле, каля 50 - у Брольніках, а ў астатніх адзінаццаці сёлах налічвалася ад 8 да 37 двароў. У Мірскім графстве да буйных паселішчаў адносіліся Любна, Сімакава, Вялікае Сяло, да невялікіх - Беражна, Радунь, Агароднікі. У 1647 годзе ў маёнтку Турэц пераважалі невялікія паселішчы Зарэчча, Баўцічы, Абрынка, Малое Сяло, Цяцелеўка, а буйнымі можна адзначыць Даўгінава, Вялетава і Пагарэлку. Пасля войнаў другой паловы XVII - пачатку XVIII стагоддзяў многія сёлы былі спустошаны і колькасць насельніцтва рэзка зменшылася, аднак да сярэдзіны XVIII стагоддзя і асабліва ў яго другой палавіне сёлы адбудоўваюцца і, як правіла, павялічваюць свае памеры. Да ліку буйных сёл у сярэдзіне другой палавіны XVIII стагоддзя адносіліся Заполле (176 двароў у 1727 годзе), Лукі (94 двары, 1747 годзе), Кожава (87 двароў, 1757 годзе), Жухавічы (92 двары, 1757 годзе), Аюцавічы (91 двор, 1757 годзе) і некаторыя іншыя. [14. Т.2, с.185-200, с.387-423, Т.3, с.125-126, Т.4, с.133-135].

## Рэкі.

**Нёман.** Рака Нёман бярэ пачатак недалёка ад аграгарадка Пясочнае Капыльскага раёна Слабада-Кучынскага сельсавета пры зліцці рэк Уса, Лоша, пачынаюцца ў Мінскім раёне і Неманец - Уздзенскі раён (рака практычна знікла пасля меліярацыі). Існуе такая версія паходжання назвы ракі Нёман. Сама назва ракі мае балцкую аснову. Назва ад асновы “ням”

(нямы) - ціхі, спакойны, павольны. Першапачатковая назва ракі была Кронан (сустракаецца на старых картах) і забабонныя чуткі былі, што вымаўленае ўслых "імя" ракі можа выклікаць бяду, з якімі насельніцтва лічылася. Адсюль адбылася замена на слова, якое сведчыла, што "я не магу гаварыць", "немы". Па цяперашняй тэрыторыі раёна рака Нёман працякае каля вёсак Бражнае, Крынічнае, Ярэмічы, Сіняўская Слабада і заканчвае каля урочышча Графская пушча. [12; 2]

**Уша.** Левы прыток Нёмана - рака Уша бярэ пачатак з вадасховішча каля горада Нясвіж Мінскай вобласці, ў раёне працякае паміж вёсак Хлюпічі - Вялікая Мядзвядка. Назва ракі мае балцкую аснову – "павольная". Так і да сённяшняга дня плынь ракі павольная, спакойная, як быццам стаіць на месцы. За вёскай Вялікая Мядзвядка ў яе ўпадае рака Змейка, пачатак яе каля аграгарадка Вольна ў Баранавіцкім раёне. Перад вёскай Уша ўпадае рака Цетранка, пачатак яе каля вёскі Лукі, каля вёскі Пясочная - рака Пясочная, пачатак каля вёскі Лемнікі, а перад вёскай Зарэчча - рака Міранка, пачатак яе каля вёскі Падлессе Стаўбцоўскага раёна. [12], [2], [1. Т.16, с.293-576].

**Сэрвач.** Левы прыток Нёмана - рака Сэрвач бярэ пачатак каля вёскі Сялявічы Слонімскага раёна, а затым каля граніцы з нашым раёнам выцякае з Лізараўскага вадасховішча каля вёскі Карчова. Назва ракі мае балцкую аснову – "вартаваць", "стаяць на варце". Рака ў даўнія часы была пастаянна як бы падзелам паміж варагуючымі бакамі і пры набегах татараў і пры ваеннных дзеяннях на прылеглай тэрыторыі. Па тэрыторыі раёна працякае каля вёсак Быкевічы, Цырын, Баяры, Асташын, Любанічы, Беразавец, Вялікая Слабада і урочышча Лозы Востухоўскія. Прыток ракі Сэрвач-рака Петухоўка бярэ пачатак каля вёскі Трасейкі Варанчанскага сельсавета і ўпадае паміж вёсак Красная - Цырын Цырынскага сельсавета. Прыток ракі Сэрвач - рака Карчоўка бярэ пачатак каля вёсак Равіны - Труднава, далей працякае каля вёскі Варонча Варанчанскага сельсавета, вёсак Дорагава і Застадолле Цырынскага сельсавета і ўпадае ў раку Сэрвач паміж вёсак Баяры Цырынскага - Асташын Лукскага сельсаветаў. Прыток ракі Сэрвач-

рака Рута бярэ пачатак каля вёскі Рута Навагрудскага раёна. Па тэрыторыі раёна працякае каля вёсак Амневічы, Куцавічы, Дольная Рута, Горная Рута, Бушкі, Загор'е, г.п. Карэлічы, а за пасёлкам Людвікі, каля ўрочышча Міжрэчча ўпадае ў раку Сэрвач. [2]

**Неўда.** Левы прыток Сэрвачы - рака Неўда бярэ пачатак каля вёскі Неўда Навагрудскага раёна. Па тэрыторыі раёна працякае паміж вёсак Чаромушкі Навагрудскага раёна - Сёгда Райцаўскага сельсавета. Назва ракі мае балцкую аснову – "імклівая". Імклівую плынь рака захавала і да сённяшняга дня. Прыток ракі Неўда - рака Агнеша бярэ пачатак каля вёскі Моладава і працякае каля вёскі Руднікі, а каля вескі Сёгда ўпадае ў раку Неўда. Прыток ракі Неўда - рака Зямчатка бярэ пачатак каля вёскі Міратычы і далей працякае каля вёсак Скрышава, Забердава, Зелянец, Райца, Хвалава, Шчонава, Валокі, Мокрава, Даўгінава і каля вёскі Зарэчча ўпадае ў раку Неўда. Прыток ракі Неўда - рака Крамаўка бярэ пачатак каля вёскі Сянежычы Навагрудскага раёна. Па тэрыторыі раёна працякае каля вёсак Яруга, Сапатніца, Забалацце і каля вёскі Савашы ўпадае ў раку Неўда. Рака Неўда ўпадае ў раку Сэрвач каля вёскі Беразавец Турэцкага сельсавета.

Правы прыток Нёмана - рака Чорная бярэ пачатак за ўрочышчам "Графская пушча" і працякае каля хутара Чорная, урочышча "Касавец" і праз Рудзьмянскі канал, каля ўрочышча "Гарнізоны" Ярэміцкага сельсавета ўпадае ў раку Неман. [1. Т.11, с. 560]

## Мястэчкі.

**Карэлічы.** Мястэчка Карэлічы, першае ўзгадванне ў пісьмовых крыніцах у 1395 годзе. Вядомы з XVI стагоддзя ў складзе Навагрудскага павета і ваяводства ВКЛ. У XIX - пачатку XX стагоддзя мястэчка Карэлічы цэнтр воласці, а з 1920 года цэнтр гміны Навагрудскага павета Мінскай губерні. З 1940 года цэнтр раёна Баранавіцкай, а з 1954 года - Гродзенскай вобласці. У 1962-1965 гг. у складзе Навагрудскага раёна, а ў 1965 года адноўлены Карэліцкі раён. З 30.04.1958 года гарадскі пасёлак Карэлічы.

Вёска Агароднікі ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна цяпер далучана да гарадскога пасёлка. Назва Карэлічы ўтворана ад калектыўнай назвы першаперасяленцаў, якую варта разумець у значэнні «падданыя Карэлы». Мянушку Карэла насіў выхадзец з зямлі племя карэла, які пасяліўся ў ваколіцах сучасных Карэліч з групай прадстаўнікоў гэтага племя. Мясцовае насельніцтва называла людзей, што пасяліліся на землях Карэлы, карэлічамі. Па асацыяцыі гэта калектыўнае абазначэнне было перанесена на ўзнікшае паселішча першапачаткова Каралевічы, а затым Карэлічы. [1. Т.8, с.123] [13. Т.4, с.432], [3. Т.2, с.67]

**Мір.** Мястэчка Мір, першае ўзгадванне ў пісьмовых крыніцах у 1395 годзе. Вядомы з XVI стагоддзя ў складзе Навагрудскага павета і ваяводства ВКЛ. У XIX - пачатку XX стагоддзя мястэчка Мір цэнтр воласці, а з 1921 года цэнтр гміны Нясвіжскага, з 1926 года - Стаўбцоўскага павета Навагрудскага ваяводства Мінскай губерні. З 15.01.1940 гарадскі пасёлак, цэнтр раёна Баранавіцкай, а з 1954 года - Гродзенскай вобласці. У 1962-1965 гг. у складзе Навагрудскага раёна, а з 1965 года ў складзе Карэліцкага раёна. Гарадскі пасёлак Мір да 1956 года меў статус горада і частковае Мандэрбургскае права, сваю назву паселішча атрымала ад слова «эмір» па чыне кіраўніка размясціўшагася тут атрада воінаў-татараў. У даўнія часы ў мястэчку мірна ўжываліся балты і славяне, татары, яўрэі і цыганы. [1. Т.10.с.460], [13. Т.5, с.205], [3. Т.3. с.352], [6. с.234-235]

## Паселішчы.

**Мірскі сельсавет** [11. с.590-597]

**аг.Аюцавічы.** Сяло і фальварак Аюцавічы маёнтка Мір прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Аюцавічы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Першыя

пасяленцы выкарыстоўвалі ў размове часціцу "аюц" і празвалі іх аюцкаўцамі, а паселішча Аюцкавічы, затым Аюцавічы.

**в.Бербашы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя засценак Бербашы ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Бербашы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва вёскі ад татарскага “Бер” – імя першага пасяленца, а “башы” – старэйшы.

**в.Беражна.** Сяло Беражна маёнтка Мір прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XVII - XVIII стагоддзях сяло Мірскага графства. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Беражна ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Беражна Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва вёскі ад яе размяшчэння, а стаіць яна на самым беразе ракі Неман.

**в.Возерскае.** Фальварак Мірскага графства Возерскае прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Возерскае ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Возерскае Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва паселішча ад размяшчэння каля урочышча “Азёршчына”. Лясны балоцісты масіў з азярынамі, геалагічны помнік прыроды.

**в.Вялікая Мядзвядка.** Фальварак Мядзвядка Мірскага графства прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. Прыкладна ў пачатку стагоддзя быў падзелены на два фальваркі Вялікая і Малая Мядзвядка. У 1777-1779 гадах у маёнтак уваходзілі двор і сяло Вялікая Медзвядка. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Вялікая Мядзвядка ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1921-1939 гадах у Паланэчкаўскай гміне Баранавіцкага павета, з 1926 года у Стаўбцоўскім павеце Навагрудскага ваяводства. У 1926 годзе вёска Вялікая Мядзвядка Навагрудскага ваяводства Жухавіцкая вясковая гміна. Назва паселішча ад

прозвішча кіраўніка маёнтка Мядзвецкі, вялікі і пануры і мянушку яму далі “мядзвяк” і сыны падобны на яго. З часам людзі сталі падобнымі на гаспадара, а вёску ў акрузе сталі называць “мядзведзяўкай”. Так і захавалася назва Мядзвядка, а затым, пасля падзелу, Вялікая Мядзвядка і Малая Мядзвядка.

**в.Вялікае Сяло.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вялікае Сяло Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва ад велічыні паселішчы для мястэчка замала, а для сяла вялікае. Так і прыжылася назва Вялікае Сяло.

**в.Гарачкі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя засценак Гарачкі ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерніі. У 1923 год вёска Гарачкі Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. У час Мірскага графства пасяляюць даволі гарачых, запальчывых людзей і ў пасёлку было спакайней. Ад таго і пайшла назва паселішча.

**в.Засценкі.** Паселішча ўзнікла пасля рэформы 1557 года вядомай як “устава на валокі”. Пасля перамеру зямлі, засталіся адзінкі зямлі “за мяжою” ці “за сцяною”, якія знаходзіліся ў канцы поля і перадаваліся дробнай шляхце. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Засценкі ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Засценкі Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна.

**в.Крынічнае.** Аколіца Крынічнае прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерніі. У 1923 годзе вёска Крынічнае Навагрудскага ваяводства Несвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Побач былі размешчаны асада Крынічнае і леснічоўка Крынічнае. Назва вёскі паходзіць ад наяўнасці крыніц на тэрыторыі, недалёка ад ракі Нёман.

**в.Лужа.** У XIX - пачатку XX стагоддзя маёнтак Лужа ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерніі. У 1923 годзе сяло Лужа Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад першапасяленцаў з племя лужычане.

**в.Любна.** Сяло Любна Свержанскай воласці Навагрудскага павета прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. З 1712 года ў Мірскім графстве. У XIX - пачатку XX стагоддзя у Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1880 годзе сяло Любна ўваходзіць у склад маёнтка Любна. У 1923 годзе вёска Любна Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага павета (з 1926 года Стаўбцоўскага) Мірская вясковая гміна. Прыгожыя лясныя мясціны з палянамі, дзе любіла адпачываць і прызначаць сустрэчы шляхта, любімае (любнае) месца. Ад гэтага і пайшла назва паселішча.

**в.Малая Мядзвядка.** Сяло Малая Мядзвядка прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення ў пачатку XVII стагоддзя пры падзеле фальварка Мядзвядка на два, Вялікая Медзвядка і Малая Мядзвядка. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Малая Мядзвядка ў Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1858 годзе ў склад маёнтка ўваходзілі панскі двор Мядзвядка і сяло Малая Медзвядка. У 1921-1939 гадах у Паланэчкаўскай гміне Баранавіцкага павета, з 1926 года у Стаўбцоўскім павеце Навагрудскага ваяводства. У 1926 годзе вёска Малая Мядзвядка Навагрудскага ваяводства Жухавіцкая вясковая гміна.

**в.Міранка.** 1923 год фальварак Міранка Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага павета (з 1926 года Стаўбцоўскага) Мірская вясковая гміна. Побач былі размешчаны засценак Міранка Старая і Міранка асада млыновая. Назва пайшла ад размяшчэння каля ракі Міранка ў лясным масіве.

**в.Прылукі.** Фальварак у Мірскім графстве прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У 1923 годзе вёска Прылукі

Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва ад размяшчэння ў лукавіне ракі Міранка.

**в.Сімакава.** Сяло Мірскага графства Сімакава прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У 1923 годзе вёска Сімакава Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва ад таго, што перад вёскай, справа, было поле гаспадара Сімона Машэчкі і сядзіба ў вёсцы.

**в.Студзёнка.** Прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе як вёска Залаззе. Студзёная, калонія ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года вёска Студзёнка Стаўбцоўскага павета Навагрудскага ваяводства Турэцкая вясковая гміна. Першая назва ад размяшчэння ў балоцістай мясцовасці дзе расла лаза, а другое - ад таго што заўсёды было вільготна і зябка.

**в.Хлюпічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Хлюпічы ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1921-1939 гадах у Паланэчкаўскай гміне Баранавіцкага павета, з 1926 года у Стаўбцоўскім павеце Навагрудскага ваяводства. У 1926 годзе вёска Хлюпічы Навагрудскага ваяводства Жухавіцкая вясковая гміна. Назва ад размяшчэння паселішча на беразе ракі Змейка, хлюпкая мясцовасць была.

**Жухавіцкі сельсавет** [11. с.600-604]

**аг.Вялікія Жухавічы.** Сяло Вялікія Жухавічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XV стагоддзе. У 1777 годзе фальварак Жухавічы складалі панскі двор Жухавічы і сёлы Вялікія Жухавічы і Кожава. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Вялікія Жухавічы цэнтр Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вялікія Жухавічы цэнтр вясковай гміны Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета. Браты па прозвішчу Жухавец пабудавалі на рэчцы Уша млын. Непадалёк утвараецца паселішча, пасяленцаў якога празвалі жухаўцамі, а затым і паселішча пачалі называць Жухавічы. У XVII стагоддзі паселішча было падзелена на Вялікія і Малыя Жухавічы.

**в.Бурдзевічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Бурдзевічы Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Бурдзевічы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага павета Жухавіцкая вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад прозвішча першага пасяленца Бурдзевіч.

**в.Кожава.** Сяло Кожава Мірскага графства прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Кожава Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Назва ад майстроў падсобных промыслаў па вырабе скуры, а з цягам часу тут была створана мануфактура.

**в.Лемнікі.** Прыкладны пачатак ўтварэння і станаўлення 1940 год з хутароў, якія паступова зносіліся. Назва паселішча ад таго, што першапасяленцы выкарыстоўвалі ў размове часціцу "лем".

**в.Малыя Жухавічы.** Фальварак Жухавічы Малыя прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XV стагоддзе. У XVII стагоддзі аддзелена ад пасялення Вялікія Жухавічы, як сяло Малыя Жухавічы. У XVII - XVIII стагоддзях сяло Малыя Жухавічы Мірскага графства. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Малыя Жухавічы у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Малыя Жухавічы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна.

**в.Негнічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя фальварак і маёнтак Негнічы у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Негнічы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Нега - зачараванне, салодаснае заспакаенне духоўнае, маральнае, летуценнае забыццё. Такімі былі першыя пасяленцы, адтаго так назвалі паселішча .

**в.Пясочная.** Сяло і фальварак Пясочная Мірскага графства прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Пясочная у Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска і фальварак Пясочная Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Назва ад пясочных зямель, на якіх размешчана вёска і ракі Пясочная, якая працякае побач.

**в.Радунь.** Прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XVII - XVIII стагоддзях сяло Мірскага графства. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Радунь у Мірскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Мірская вясковая гміна. Першыя пасяленцы заўсёды былі радаснымі і смутку на іх твары ніколі ніхто не бачыў, таму так і назвалі паселішча.

**в.Трашчычы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Трашчычы у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Трашчычы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Назва ад размяшчэння мануфактуры трашчэння нітак, якая была адзінай у Мірскім графстве.

**в.Уша.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Уша у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Уша Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Назва ад размяшчэння на беразе ракі Уша.

**в.Церабостынь.** Сяло Церабостынь Жухавіцкага царкоўнага прыходу прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Церабостынь у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Церабостынь Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета

Жухавіцкая вясковая гміна. Назва ад размяшчэння мануфактуры цераблення льна і канаплі.

**в.Юравічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Юравічы у Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1921-1939 гадах у Паланэчкаўскай гміне Баранавіцкага павета, з 1926 года у Стаўбцоўскім павеце Навагрудскага ваяводства. У 1923 годзе вёска Юравічы Навагрудскага ваяводства Жухавіцкая вясковая гміна. Назва вёскі ўтворана ад прозвішчаў першапасяленцаў Юрэвіч. У пачатку называлі паселішча Юрэвічамі, а затым для зручнасці Юравічы, ды так і прыжылося.

**Красненскі сельсавет** [11. с.604-610]

**аг.Краснае.** Краснае сяло маёнтка Карэлічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Краснае у Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Краснае Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Першапачаткова паселішча з назвай Краснае ад размяшчэння ў прыгожым (красным) месцы, а ў пачатку XX стагоддзя назва Краснае падцверджана рэвалюцыйным настроем жыхароў.

**в.Амневічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Амневічы ў Гарадзечанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Амневічы Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча арандатара Амневіч.

**в.Барацін.** Сяло Барацін узгадваецца ў 1601 годзе ў вопісе зямель Лаўрышаўскага манастыра, якому ў гэты час яны належалі. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Барацін у Гарадзечанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Барацін Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча манаха-ўладара Барацінскі.

**в.Бушкі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Бушкі у Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Бушкі

Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад прозвішчаў першых пасяленцаў – Бушка.

**в.Вірышча.** У ХІХ - пачатку ХХ стагоддзя сяло Вірышча ў Шчарсоўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вірышча Навагрудскага ваяводства і павета Шчарсоўская вясковая гміна. Назва паселішча ад размяшчэння на краі балоцістай мясцовасці, дзе было шмат віроў, у цяперашні час мясцовасць асушылі.

**в.Востухава.** У 1717 годзе сяло і маёнтак Востухава ў Навагрудскім павеце, а з 1799 года сяло адносіцца да Шчарсоўскага маёнтка. У ХІХ - пачатку ХХ стагоддзя сяло Востухава ў Шчарсоўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Востухава Навагрудскага ваяводства і павета Шчарсоўская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча пана Астухоўскага.

**в. Горная Рута.** Сяло і маёнтак Горная Рута ўзгадваецца ў дакументах 1613 года, што належалі Кіеўскаму мітрапаліту, рэзідэнцыя якога знаходзілася ў Навагрудку. У ХVІІ - ХVІІІ стагоддзях сяло і маёнтак Горная Рута Навагрудскага павета. У ХІХ - пачатку ХХ стагоддзя сяло Горная Рута ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Горная Рута Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва вёскі паходзіць ад ракі Рута, якая працякае побач. Горная - размешчана на горцы. У даўніну па берагах ракі Рута расла трава рута. Рута, шматгадовая травяністая лекавая расліна з жоўтымі кветкамі, мае моцны водар, дасягае ў вышыню 50-100 санціметраў. Шырока ўжывалася ў народнай медыцыне. Зараз трава рута ў Беларусі рэдкая расліна.

**в.Дольная Рута.** Маёнтак Дольная Рута, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення ХVІІІ стагоддзе. У ХІХ - пачатку ХХ стагоддзя сяло Дольная Рута ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Дольная Рута Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва вёскі паходзіць ад ракі Рута, якая працякае побач, а вёска ў даліне.

**в.Жукі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Жукі у Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Жукі Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішчаў першых перасяленцаў – Жук.

**в.Загор`е.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Загор`е ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Загор`е Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Паселішча размешчана як бы за гарою.

**в.Заполле.** Сяло Заполле маёнтка Карэлічы прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Заполле ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Заполле Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва вёскі паходзіць ад яе размяшчэння, за палямі з усіх бакоў.

**в.Кальчычы.** Старыя Кальчыцы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе, адносіліся да маёнтка Паланая, а затым да маёнтка Шчорсы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Старыя і Новыя Кальчычы ў Шчорсаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Кальчычы Навагрудскага ваяводства і павета Шчорсаўская вясковая гміна. Калі ў XVI стагоддзі Вялікі князь Аляксандр надаў пасяленне разам з людзьмі і зямлёй Ф. Калантаю, уладальніку маёнтка Паланая, наглядчыкам быў прызначана немец Кальчыц, які пасяліўся ў сядзібным доме.

**в.Камаровічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Камаровічы ў Шчорсаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Камаровічы Навагрудскага ваяводства і павета Шчорсаўская вясковая гміна. Назва ад прозвішчаў першых перасяленцаў – Камаровіч.

**в.Куцавічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Куцавічы ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923

годзе вёска Куцавічы Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва ад прозвішчаў першых перасяленцаў – Куцэвіч.

**в.Лясок.** Сяло маёнтка Карэлічы (Міхалін фальварак) прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Лясок маёнтка Карэлічы у Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лясок Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Калісьці ў гэтым балоцістым месцы працякала рака, а на балоце раслі лекавыя травы. Першым пасяліўся ў гэтых месцах знахар па прозвішчы Ляска. Да яго звярталіся пасяленцы з просьбамі аб дапамозе і пры нядужанні казалі "неабходна ісці да Ляска". З часам у гэтым месцы ўтварылася паселішча. Па звычцы людзі казалі, калі ішлі ў паселішча "ісці да Ляска", а потым і паселішча стала звацца Лясок.

**в.Навашыно.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Навашыно ў Шчорсаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Навашыно Навагрудскага ваяводства і павета Шчорсаўская вясковая гміна. Паселішча размешчана на ўзгорку, на вышыні, таму і назвалі Навашыно.

**в.Пагор`е.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Пагор`е ў Шчорсаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Пагор`е Навагрудскага ваяводства і павета Шчорсаўская вясковая гміна. Назва паселішча ад размяшчэння па ўзгорках.

**в.Паланая.** Узгадваецца ў 1428 годзе як уладанне вялікага князя Літоўскага, а ў 1601 годзе ў вопісу зямель Лаўрышаўскага манастыра, якому ў гэты час яны належалі. Назва вёскі паходзіць ад манашак-палатынак, якія пасяліліся тут для апрацоўкі зямель манастыра. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Паланая маёнтка Карэлічы ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Паланая Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна.

**в.Пятрыкі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Пятрыкі ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923

годзе вёска Пятрыкі Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна. Назва ад большасці імён першых пасяленцаў – Петрык.

**в.Працяневічы.** Сяло Працяневічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе, уваходзіла ў двор Паланая. У XVII стагоддзі належала Радзівілам. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Працяневічы ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Працяневічы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча старэйшыны баяр-пасыльных Працяневіч.

**в.Руціца.** Сяло Руціца, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе, ўваходзіла ў Карэліцкі праваслаўны прыход. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Руціца ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Руціца Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва паселішча паходзіць ад размяшчэння на беразе ракі Рута.

**в.Садовая.** Раней вёска Бабнева, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. Бабунева ўладанне сям'і Машынскіх, якія з'ехалі за мяжу, а маёнтак пакінулі бабулі з сям'і пані Машынскай (дзявочае Бабунова), адсюль і назва. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Бабнева маёнтка Карэлічы ў Гарадзечненскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Бабнева (з 30.06.1964 Садовая) Навагрудскага ваяводства і павета Гарадзечненская вясковая гміна.

**в.Стрэльнікі.** Вёска Стрэльнікі, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Стрэльнікі ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Стрэльнікі Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Першапачаткова паселішча засялялі стралкі-баяры, так і назвалі яго Стрэльнікі.

**в.Тударава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і аколіца Тударава ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе

вёска Тударава Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад літоўскага імя (vardas Tydaras) Тудара, першых балцкіх пасяленцаў.

**Лукскі сельсавет** [11. с.611-614]

**аг.Лукі.** Вёска Лукі ўпершыню ўзгадваецца ў дакументах пачатку XV стагоддзя, як сяло ўладанне вялікага князя Вітаўта, якое ён перадаў касцёлу ў Навагрудку. У 1518 годзе князь Жыгімонт пацвердзіў гэта наданне. Размешчана на беразе ў лукавіне ракі Цетранка, адсюль і назва. У XVIII стагоддзі ў складзе Мірскага графства. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Лукі і маёнтак Цетра ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лукі Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна.

**в.Асташын.** Сяло Асташын узгадваецца ў 1428 годзе, як уладанне вялікага князя літоўскага Вітаўта, якое ён перадаў сваёй жонцы Ульяне. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Асташын “драўляны” і Асташын “мураваны”, маёнтакі Асташын Далматаўскі (панскі двор і частка сяла Асташын) і Асташын (частка сяла Асташын і сяла Вышкава, аколіца Рукаўчыцы) у Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Асташын Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча пана Асташынскага, які арандаваў паселішча з навакольнымі землямі ў князя Вітаўта.

**в.Баяры.** Сяло Баяры ўзгадваецца ў 1798 годзе ў вопісе царкоўных прыходаў Далматаўшчынскай царквы. Назва паходзіць ад пасяленцаў племя баяры, якія першапачаткова пасяліліся. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Баяры ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Баяры Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна.

**в.Вышкава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Вышкава, засценак Ксяндзоўшчына ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вышкава Навагрудскага ваяводства

Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Першапасяленцамі была высокая знаць, так і паселішча назвалі.

**в.Далматаўшчына.** Сяло і маёнтак Далматаўшчына ўзгадваецца ў 1676 годзе ў судовых актах ВКЛ. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, маёнтак Далматаўшчына і два фальваркі ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Далматаўшчына Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна. Сяло, маёнтак і навакольныя землі прыналежалі пану Далматоўскаму, адсюль і назва.

**в.Крышылоўшчына.** Першае ўзгадванне аб маёнтку Крышылоўшчына было ў судовым акце ВКЛ за 1660 год, як аб сядзібе пана А. Швяйкоўскага. У 1777 годзе маёнтак Крышылоўшчына належыць наваградскаму земскаму суддзі Крышылоўскаму, а паселішча назвалі Крышылоўшчына. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, маёнтак і фальварак Крышылоўшчына ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Крышылоўшчына Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна.

**в.Любанічы.** Сяло Баярскае маёнтка Карэлічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і два фальваркі Любанічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Любанічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Першапасяленамі былі баяры і паселішча называлі Баярскае. З цягам часу паселішча стала любімыі месцам збору знаці з назваю Любанічы.

**в.Унехава.** Двор Унехава, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе адносіцца да Мірскага маёнтка. Назва паходзіць ад прозвішча гаспадара – Унехаў. У 1568 годзе маёнтак Путкамераў Унехава захаваў назву пасля таго як Юрый Іллініч перадаў унехаўскія ўладанні (вёска Крышылоўшчына) служку Цімафею Крышылоўскаму. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, двор і маёнтак Унехава ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага

павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Унехава Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага (з 1926 года Стаўбцоўскага) павета Жухавіцкая вясковая гміна.

**Малюшыцкі сельсавет** [11. с.614-620]

**аг.Малюшычы.** Сяло Малюцічы ў Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XV стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальваракі Малюшычы ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Малюшычы Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча арандатара Малюціцкі.

**аг.Палужжа.** Сяло Палужжа, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XV стагоддзе, ўпамінаецца ў Літоўскай метрыцы. У XVII - XVIII стагоддзях сяло і фальварак Палужжа ў Навагрудскім павеце. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і два фальварка Палужжа і сяло Палужжа ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні, належала маёнтку Карэлічы. У 1923 годзе вёска Палужжа Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва паходзіць ад пасяленцаў племя лужычане, якія першапачаткова пасяліліся пры лузе і называлася першапачаткова паселішча Прылуззе, а затым Палужжа.

**в.Аколіца.** Аколіца Малюціча, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. Паселішча дробнай шляхты, якая ссялялася асобна ад сялян-вяскоўцаў называлі аколіцай. У XIX - пачатку XX стагоддзя фальварак Аколіца ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Аколіца і фальварак Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна.

**в.Баранавічы.** Паселішча Баранаўка. Сяло Баранавічы ў Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. Назва паходзіць ад прозвішча пана Бараноўскага. У 1799 годзе маёнтак Баранавічы ўключаў двор Баранавічы і сёлы Баранавічы і Зарэчча. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Баранавічы ў Райцаўскай воласці

Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Баранавічы Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. У 70-е гады XX стагоддзя да вёскі далучана вёска Цімошкавічы.

**в.Белая.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Белая ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Белая Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Паселішча размешчана на гарыстай мясцовасці, дзе раслі акацыі. Вясной пры красаванні акацый усё было белым, так і назвалі паселішча.

**в.Волца.** У XIX - пачатку XX стагоддзя асада Волца ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Волца Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва паходзіць ад пасяленцаў племя волічы, якія першапачаткова пасяліліся ў паселішчы.

**в.Вялікія Тупалы.** Сяло і аколіца Тупалы ўзгадваецца ў 1392 годзе, маёнтак Тупалы – у 1655 годзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Вялікія Тупалы ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні, належала маёнтку Карэлічы. У 1923 годзе вёска Вялікія Тупалы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад татарскага "Туралы". Спачатку паселішча было аддадзена татару Ісупу, а пасля Сяіцю з сынам і падзелена на Вялікія і Малыя Тупалы.

**в.Горныя Руткавічы.** Маёнтак Руткавічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. Маёнтак уключаў двор Руткавічы, сёлы Новая, Зарэчча, часткова Горная і Качычы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Горныя Руткавічы (Горная) і два фальваркa ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Горныя Руткавічы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад перасяленцаў з сяла Рутка (цяпер Навагрудскага раёна). Іх тады называлі руткаўцамі, а паселішча назвалі Руткавічы, горныя ад размяшчэння на гарыстай мясцовасці.

**в.Даўгінава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Даўгінава ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Даўгінава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назву надалі перасяленцы з наднёманскага Даўгінава. Перасяліліся людзі і назву роднай вёскі ўзялі з сабой.

**в.Забалацце.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Забалацце ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Забалацце Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва ад асаблівасці геаграфічнага становішча паселішча – знаходзіцца за балотам.

**в.Зарэчча.** Сяло Зарэчча, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе, адносілася да маёнтка Баранавічы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Зарэчча ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Зарэчча Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Вёска, па іншы бок ракі, за ракой, так і назвалі Зарэчча.

**в.Качычы.** Сяло Качычы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе, уваходзіла ў склад двара Паланая. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Качычы ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Качычы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча прыказчыка Качыц.

**в.Лукашын.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Лукашын ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лукашын Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Размешчана на беразе ў шырокай лукавіне ракі Нёвда, адсюль і назва.

**в.Машэвічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Машэвічы ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Машэвічы Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая

гміна. У наваколлі быў фальварак Машэвічы, ўладанні князя С. Чымашэвіча, адкуль і пашла назва вёскі Машэвічы.

**в.Людвікі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя фальварак Людвікі ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе фальварак Людвікі Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва пайшла ад імя кіраўніка фальваркам Людвіка.

**в.Малыя Тупалы.** Аколіца Тупалы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе, ў складзе маёнтка Рута (Навагрудскі раён). У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Малыя Тупалы ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Малыя Тупалы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад татарскага "Туралы". Належала сыну татара Сяіцю. Малыя Тупалы з-за таго, што меншая за Вялікія Тупалы.

**в.Моладава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і два фальваркі Моладава ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Моладава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. За вёскай ёсць месца, дзе шмат крыніц і выцякае невялікая рэчка. У даўнія часы недалёка знаходзіўся маёнтак пана Халявінскага. Жонка яго (пол. pani Agnieszka) Агнешка любіла прыроду і патрабавала ад прыслугі каб утрымлівалі гэта крынічнае месца ў парадку. Любіла гэта месца і моладзь, і пажылыя. Папіць крынічнай вадзіцы ў гарачае надвор'е і памыць твар было адно задавальненне. А вада ў крыніцах была вельмі чыстаю, а калі памыць твар, то маладзей стане. Вось і назвалі паселішча Моладава, а рачулку назвалі Агнеша.

**в.Навасёлкі.** Сяло Навасёлкі ў Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Навасёлкі ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Навасёлкі Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Пасля правядзення зямельнай рэформы ў ВКЛ у

XVI стагоддзі ўтварылася паселішча з назваю Навасёлкі, так як у наваколлі ужо былі сёлы, а гэта - новае паселішча.

**в.Новыя Руткавічы.** Маёнтак Руткавічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Руткавічы (Новыя) і маёнтак ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Новыя Руткавічы і асада млыновая Руткавічы Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва ад перасяленцаў з сяла Рутка (Навагрудскі раён). Іх тады называлі руткаўцамі, а паселішча назвалі Руткавічы, новыя таму што ўтварылася паселішча пасля Горных Руткавіч.

**в.Равіны.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Равіны ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Равіны Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назву надалі перасяленцы з падваранчанскіх Равін. Перасяліліся людзі і назву роднай вёскі ўзялі з сабой.

**в.Руднікі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Руднікі ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. Уласнасць пана Варковіча, які ў 1939 годзе з'ехаў у Польшчу. У 1923 годзе вёска Руднікі Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва паходзіць ад таго, што першапасяленцы плавілі жалезную руду ў спецыяльных печах, якія размяшчаліся вакол паселішча.

**в.Савашы.** Сяло Савашы ў Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Савашы ў Карэліцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Савашы Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. Назва ад татарскага імя Саваш, які быў першапасяленцам.

**в.Сапатніца.** Сяло Сапатніца, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе, уваходзіць у Сянежыцкі царкоўны прыход. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Сапатніца ў Райцаўскай воласці

Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Сапатніца Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Цяжка было жыць у паселішчы размешчаным на гарыстай мясцовасці. Апрацоўка зямлі патрабавала шмат сілы - “сапаць і папацець прыдзецца” ад гэтай работы.

**в.Селішча.** Сяло Селішча, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Селішча ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Селішча Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна.

Пасля правядзення зямельнай рэформы ў ВКЛ у XVI стагоддзі ўтварылася паселішча з назваю Селішча. Назва ад недалёка размешчанага селішча першабытных людзей. З 1995 года не існуе.

**в.Скорава.** Сяло Скорава ўзгадваецца ў 1798 годзе ў вопісе царкоўных прыходаў. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Скорава ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Скорава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння паселішча скрозь па глыбокім яры (рове).

**в.Сэрвач.** Маёнтак і сяло Сэрвач у Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVI стагоддзе. У 1777 годзе ў склад маёнтка Сэрвач уваходзілі двор і сёлы Сэрвач і Любанічы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Сэрвач ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска і фальварак Сэрвач Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння на беразе ракі Сэрвач.

**в.Смольчычы** і фальварак Смольчычы ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Карэліцкая вясковая гміна. У паселішчы працавала смалакурня і ў наваколлі стаяў запах смалы.

**в.Яруга.** Сяло Яруга ў Навагрудсім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У 1798 годзе адносіцца да Ваўковіцкага царкоўнага прыходу. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Яруга ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе

вёска Яруга Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад размяшчэння ў яры, а наўкол высокія горы.

**Райцаўскі сельсавет** [11. с.620-624]

**аг.Райца.** Сяло і маёнтак Райца, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе, ў складзе Навагрудскага павета. У 1777 годзе маёнтак Райца належаў Ф.Раецкаму, ўключаў панскі двор і сяло Райца, а з 1799 года сяло Райца ў складзе маёнтка Забердава. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Райца цэнтр воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Райца цэнтр гміны Навагрудскага ваяводства і павета. Назва пайшла ад прозвішча пана - Раецкі.

**в.Дуброва.** У XIX - пачатку XX стагоддзя Сяло Дуброва (Новая Райца) ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Дуброва Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва адлюстроўвае асаблівасці расліннасці ў ваколіцах вёскі: дубрава – дубовы лес які быў высечаны пры пабудове паселішча.

**в.Забердава.** Сяло і маёнтак Забердава, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У 1779 годзе маёнтак Забердава належаў Навагрудскаму езуіцкаму калегіуму. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Забердава ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1844 годзе ў складзе маёнтка Райца. У 1923 годзе вёска Забердава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва паходзіць ад слова "бёрда", гэта частка ткацкага станка "кроснаў". У паселішчы майстравалі "бёрда" і добрай якасці. Майстры сакрэт трымалі пры сабе. Вось з усёй акругі і хадзілі ў вёску за "бёрдамі". Так паселішча назвалі Забердава.

**в.Зелянец.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Юрздыка ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Юрздыка Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна (знаходзілася ў вёсцы Юрздыка). Назва паходзіць ад “Юрыдыка”, мясцовасць

якая знаходзілася пад уплывам царквы. З 30.06.1964 пераіменавана ў вёску Зелянец. Назва ад месца знаходжання ў лясным масіве.

в.**Караліны.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Караліны ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Караліны Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва ад імя гаспадара Караль, якому належаў фальварак.

**в.Лагаватка.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Лагаватка ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лагаватка Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння ў лагчыне на тарфяніках, мяккіх як вата.

**в.Міратычы.** Маёнтак Міратычы ўзгадваецца ў 1538 года, ён належаў А.Кашырскаму. На той час налічвалася сем фальваркаў і Міратычы, асада. Сяло Міратычы Навагрудскага павета ўпамінаецца ў 1578 годзе. У 1777 годзе ўсходні маёнтак Міратычы ўключаў панскі двор, частку сёл Міратычы і Скрышава, западны маёнтак Міратычы ўключаў панскі двор, частку сяла Міратычы і сяло Валеўка. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Міратычы ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Міратычы Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва паходзіць ад прозвішча таленавітага майстра-самародка Мірачыцкага, якога ў XVI стагоддзі выкупіў пан з Асташына і пасяліў у вёсцы Баяры.

**в.Плужыны.** Сяло і маёнтак Плужыны Навагрудскага павета. прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У 1777 годзе маёнтак ўключаў панскі двор і сяло Плужыны. У 1844 годзе маёнтак ўключаў панскі двор, вёскі Плужыны і Кунявічы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Плужыны, Плужыны Старыя, фальварак і леснічоўка Плужыны ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Плужыны Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва

паходзіць ад размяшчэння на мясцовасці, якую называлі ў даўніну “Плюжыны” (гай “Цёмны Бор”).

**в.Рамейкі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Рамейкі ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Рамейкі Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва ад гістарычаскага слова “ramiai” – “спакойна, ціха”, адкуль “рамейка” – ціхае і спакойнае месца.

**в.Русацін.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Русацін ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Русацін Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва ад першых перасяленцаў русаў і прозвішча старэйшыны Русак.

**в.Сёгда.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Сёгда ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска і фальварак Сёгда (уладанне пана Чэчата) Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Першым перасяленцам быў манах па прозвішчу Сягдзінскі.

**в.Скрышава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Скрышава ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1844 годзе ўваходзіла ў склад маёнтка Райца. У 1923 годзе вёска Скрышава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння на скрыжаванні дарог у рву і бачныя спачатку дахі “крыши” , а потым хаты цалкам.

**в.Францішкова.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Францішкова ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні, адносілася да маёнтка Райца. У 1923 годзе вёска Францішкова Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Раней называлася Печышча, размешчана на ўзгорку, як на печы. Пасля перасялення з хутароў Грабаўка казалі “перасялілі да Францішка”.  Францішак – імя гаспадара першага двара ў сяле Печышча, які быў старэйшынай. Так і прыжылася назва Францішкова.

**в.Хвалава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Хвалава ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні, адносілася да маёнтка Райца. У 1923 годзе вёска Хвалава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Размяшчаецца на ўзгорках, як на хвалях.

**в.Шчонава.** Сяло Шчонава ўзгадваеццы ў 1662 годзе ў судовых дакументах ВКЛ. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Шчонава ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Шчонава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча кіраўніка фальварка Шчанавецкі.

**в.Ятвезь.** Сяло Ятвезь узгадваецца ў 1655 і ў 1659 гадах у судовых актах ВКЛ. У 1777 годзе сяло і фальварак Ятвезь Навагрудскага павета. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Ятвезь ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Ятвезь Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва паходзіць ад імя балтыйска-прускага племені яцвягаў. Адзін з іх бясстрашны паляўнічы пасяліўся ў гэтым месцы дзе цяпер вёска.

**х.Галянова.** У XIX - пачатку XX стагоддзя хутар і леснічоўка Галянова ў Райчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе хутар Галянова Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва ад месца размяшчэння на ўзвышшы дзе мала расліннасці.

**Варанчанскі сельсавет** [11. с.597-600]

**аг.Варонча.** Сяло і маёнтак Варонча Навагрудскага павета, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У 1799 годзе ў складзе маёнтка Варонча панскі двор і сёлы Варонча, Літараўшчына і Равіны. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і маёнтак Варонча ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1858 годзе ў маёнтак Варонча ўваходзілі панскі двор і сёлы Варонча, Літараўшчына, Раманы, Бабонеўка, Плужыны, Равіны і Русацін. У 1923 годзе вёска і фальварак Варонча Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва

паходзіць ад таго, што першапасяленцы займаліся выплаўкай жалеза ў спецыяльных печах і іх называлі “варонцамі”.

**в.Белыя Лугі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя фальварак – сядзіба - аколіца Белыя Лугі ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Белыя Лугі Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва паходзіць ад першых пасяленцаў племя лугіі і ад размяшчэння паселішча ва урочышчы Белыя Лугі. Лугі ад рамонка здаваліся белымі.

**в.Горбатавічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Горбатавічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Горбатавічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння ў гарыстай мясцовасці, на горках як на гарбах.

**в.Дашкі.** Аколіца Дашкі. Назва ад прозвішча старэйшага пасяленца Дашак. Не існуе з 1949 года.

**в.Куневічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Куневічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Куневічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва ад прозвішчаў першых перасяленцаў – Куневіч.

**в.Літараўшчына.** Сяло Літараўшчына Навагрудскага павета, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе, ўваходзіла ў склад маёнтка Варонча. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Літараўшчына ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Літараўшчына Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва паселішча паходзіць ад першапасяленцаў балтаў "літоўскай абшчыны".

**в.Мінакі.** Сяло маёнтка Каросна Навагрудскага павета, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло маёнтка Беляны ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета

Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска і фальварак Мінакі Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Хто не едзе, хто не ідзе стараліся абмінуць паселішча з-за дурных чутак пра невылечную хваробу, або пра ягады атрутныя.

**в.Падгайна.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Падгайна ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Падгайна Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння пад гаем.

**в.Равіны.** Сяло Равіны ў складзе маёнтка Варонча, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Равіны ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Равіны Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва ад яўрэйскага – раввін "старэйшы", які быў пераселены ў часы Мірскага графства з Міра.

**в.Раманы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Раманы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Раманы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Першапасяленцы з Міра, можа і не цыгане, але звярталіся адзін да аднаго па цыганскі "рамалэ", таму так і назвалі паселішча.

**в.Саленікі.** Сяло Саленікі Валеўскага царкоўнага прыходу, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Саленікі і аколіца Сапліцава ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Саленікі Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва паселішча ад размяшчэння мануфактуры па засолцы грыбоў.

**в.Сапліца.** Цяжка было жыць у паселішчы "сапаць пыходзілася" ад такого жыцця. Адсюль і назва. Не існуе з 1958 года

**в.Трасейкі**. У пачатку XX стагоддзя аколіца Трасейкі ў Гарадзішчанскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Трасейкі Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая

гміна. Хата ад хаты размешчаны на адлегласці і нават не відаць "растрэсены ў пачатку поймы ракі Петухоўка, якая налічвае аж пяць маленькіх рачушак".

**в.Труднава.** У канцы XIX стагоддзя аколіца Труднава ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Труднава Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Паселішча размешчана ў пойме ракі Карчоўка. Цяжка было жыць, восенню і зімой не даехаць, ні дайсці і пасля дажджу таксама, а рака пастаянна выкарчоўвае дрэвы, якія растуць па берагах і псуе сенажаці .

**в.Ціневічы.** У 1888 годзе сяло і фальварак Ціневічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска і фальварак Ціневічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Фальварак пана Цінеўскага, а пасяленцаў звалі "цінеўчанамі", так і прыжылася назва паселішча Ціневічы.

**Турэцкі сельсавет** [11. с.625-630]

**аг. Турэц.** Хроніка ВКЛ узгадвае сяло Турэц у 1276 годзе падчас супасташальных паходаў галіцка-валынскіх князёў у саюзе з татарамі на Навагрудак. У XVI стагоддзі прыватнае ўласніцкае мястэчка Турэц Навагрудскага павета. У XIX - пачатку XX стагоддзя мястэчка Турэц у Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Турэц Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года цэнтр гміны Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета. У беларускіх пушчах вадзіліся велізарныя першабытныя быкі, якія сімвалізуюць сілу і ўладу - туры. І людзей моцных, здаровых часцяком параўноўвалі з імі. «Сапраўдны тур!» «А гэты, - адзначалі таго, які паслабей, - турэц пакуль яшчэ...». Турцамі называлі дружыннікаў князя Тура і адзін з іх першым пасяліўся ў гэтым паселішчы. [1. Т.16, с.61-62]

**в.Беразавец.** У XV - XVI стагоддзі замак і двор Беразавец пана Івана Каліты Стратовіча. Сяло і фальварак Беразавец Навагрудскага павета ўзгадваецца ў 1601 годзе ў вопісе зямель Лаўрышаўскага манастыра, якому ў гэты час яны належалі. У XVII і першай палавіне XIX стагоддзя сяло і

фальварак Беразавец уваходзіла ў Карэліцкі маёнтак. У другой палавіне XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Беразавец у Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Беразавец Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва адлюстроўвае асаблівасці раслінласці ў ваколіцах вёскі: беразавец – бярозавы лес, які быў высечаны пры будаўніцтве паселішча.

**в.Браносава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і чатыры фальваркі Браносава у Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Браносава Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. У наваколлі размяшчаліся чатыры фальваркі пана Браносава, адсюль і назва.

**в.Вялетава.** Сяло Вялетава ўпершыню ўзгадваецца ў 1647 годзе ў складзе Турэцкага графства. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Вялетава ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вялетава Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Пасяленне ўзнікла на землях Турэцкага графства, якія былі нададзены ў арэнду графу Вялетаву.

**в.Вялікая Слабада.** Сяло Слабада ў складзе Беразавецкага панскага двара, які ўваходзіў у маёнтак Карэлічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе, а ў канцы XVIII стагоддзя частка Беразавецкага фальварка пры сяле Слабада выдзелена ў асобны фальварак. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Слабада ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вялікая Слабада Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Пасяленцы заўсёды марылі аб свабодзе і паселішча назвалі Слабада і з цягам часу

адбылося выдзяленняе ў асобны “свабодны” фальварак ад панскага двара, які з цягам часу стаў вялікім паселішчам.

**в.Загор`е.** Сяло Загора Турэцкага графства Навагрудскага павета Мінскай губерні, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе, адносілася да фальварка Уцеха. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Загор`е ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Загор`е Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад таго, што каля Турца за гарою.

**в.Качаны.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Качаны ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Качаны Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва пайшла ад позвішча першаперасяленцаў – Качан.

**в.Крынкі.** Сяло Крынкі ўзгадваецца ў 1628 годзе ў актах ВКЛ. Крынкі, фальварак ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага павета Жухавіцкая вясковая гміна. Паселішча размешчана на тарфяніках, дзе было мноства малых “крынак” - крынічак.

**в.Лыкавічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Лыкавічы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лыкавічы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва ад знатнай мануфактуры па выпрацоўцы лыка ў Турэцкім графстве.

**в.Маласельцы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Маласельцы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Маласельцы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая

гміна. Назва паселішча пайшла ад малой колькасці першаперасяленцаў-стараквераў і малых размераў паселішча.

**в.Некрашевічы** ўзгадваецца ў дакументах на пачатку XVI стагоддзя. Назва засталася ад Некрашава, асада (цяпер не існуе). У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Некрашэвічыы ў Жухавіцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Некрашэвічы Навагрудскага ваяводства Нясвіжскага павета Жухавіцкая вясковая гміна. Асада Некрашава была нададзена харунжаму С. Некрашэвіч, які меў асабісты герб "Любіч"( Цяпер там размешчана ферма). Затым на арэндаваных землях утварылася паселішча Некрашава, а потым Некрашэвічы.

**в.Навасёлкі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Навасёлкі ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Навасёлкі Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. У наваколлі былі сёлы, а гэта ў XIX стагоддзі ўтварылася як новае паселішча.

**в.Рап`ёва.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, фальварак Рап`ёва і калонія Румок ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Рап ёва Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва паселішча паходзіць ад умення спецыяльных царкоўных спеваў першаперасяленцаў "рап-певцы".

**в.Тарасавічы.** Сяло Тарасавічы ў складзе фальварка Беразавец, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Тарасавічы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Тарасавічы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Першаперасяленцы былі прыгоннымі пана Тараса і называлі іх "тарасаўцамі", а паселішчу прыжылася назва Тарасавічы.

**к.Уцеха.** Чатыры калоніі Уцеха ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна. Усе, што засталося пасля будаўніцтва дамоў польскай шляхты, было уцехаю для сялян, якія жылі тут раней і з цягам часу назвалі так паселішча .

**в.Чыжыноўцы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Чыжыноўцы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Чыжыноўцы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад прозвішча упраўляючага Чыжан, а пасяленцаў ў наваколлі празвалі "чыжанаўцамі".

**Цырынскі сельсавет** [11. с.630-634]

**аг. Цырын.** Сяло Цэрын вядома ў першай палавіне XV стагоддзя, як вялікакняжыцкае ўладанне. У 1507 годзе ўзгадваецца ў "Хронiцы Быхаўца" – старажытным айчынным летапісе. У XVII – XVIII стагоддзях цэнтр староства Навагродскага ваяводства. У 1655 годзе ўпамінаецца як сяло Цырын. 05.07.1792 года Цырыну падцверджана Магдэбурскае права і наданы герб у блакітным полі стаячы алень з залатым крыжам паміж рагамі. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Цырын цэнтр Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Цырын цэнтр гміны Навагрудскага ваяводства. Назва пайшла ад татарскага"цэрхын" – вялікі, знатны. Такое імя давалі за асаблівыя заслугі. [1. Т.17, с.152]

**в.Аканавічі.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Аканавічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Аканавічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва як і Аколіца, паселішча дробнай шляхты.

**в.Альшаны.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, выселак і фальварак Альшаны ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Альшаны Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва ад славянскага тэрміна "ольс", што азначае "чорнаальховы лес", балота з зараснікамі алешыны, часткова бярозы.

**в.Бабонеўка.** У XVIII стагоддзі сяло Бабонеўка ў Навагрудскім павеце, з 1789 года ўваходзіць у склад двара Дорагава. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Бабонеўка ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Бабонеўка Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад слова "бабоніць" - біць па метале. Знакамітыя кавалі былі ў селішчы, "бабонілі" з раніцы да вечара.

**в.Быкевічы.** Маёнтак Быковічы ўзгадваецца ў XVI стагоддзі ў дакументах ВКЛ. У 1517 годзе маёнтак быў перададзены Навагрудскай Барысаглебскай царкве. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Быкевічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Быкевічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва паселішча пайшла ад позвішча пана - Быкевіч.

**в.Валокі.** Сяло валокі ўпершыню ўпамінаецца ў 1789 годзе ў вопісу царкоўнага прыходу Райцаўскай царквы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Валокі ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Валокі Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва вёскі паходзіць ад слова “валока”. Зямельная мера памер якой вагаўся ад 21 да 32 гактараў. Пад паселішча была выдзелена пятая частка валокі зямлі, адсюль і назва “валокі”.

**в.Дорагава.** Маёнтак Дорагава, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XV стагоддзе. У 1777 годзе ў складзе двара Дорагава сёлы Дорагава, Застадолле, Рамейкі, з 1789 года далучана сяло Бабонеўка. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Дорагава ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Дорагава Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Назва пайшла ад прозвішча стольніка двара - Дарагоўскі.

**в.Застадолле.** Сяло Застадолле, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе. З 1777 года ў складзе двара Дорагава. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Застадолле ў Цырынскай воласці Навагрудскага

павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Застадолле Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Паселішча размешчана на ўзвышшы, каля даліны (за стольным долам), які належаў стольніку двара Дарагоўскаму.

**в.Кайшоўка.** Сяло і маёнтак Кайшоўка ў Навагрудскім павеце, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло і фальварак Кайшоўка ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Кайшоўка Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Сярод першаперасяленцаў было прозвішча Кайшаўскі. Бунтар, але яго падтрымлівалі і слухалі перасяленцы. Дзякуючы гэтаму ім удавалася адстойваць сабе лепшае існаванне. Сялян з-за гэтага празвалі "ваяўнічымі кайшаўцамі", а да паселішчы прыжылася назва Кайшоўка.

**в.Красная.** Сяло Красная, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVIII стагоддзе з 1978 года ў Цырынскім праваслаўным прыходзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Красная і фальварак Туганавічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Красная Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. У прыгожым месцы размешчана паселішча, побач Туганаўскі парк і ўся прыгажосць прыроды, а паселішча назвалі ад прыгажосці зямной "красным” – “прыгожым".

**в.Мокрава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Мокрава ў Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Мокрава Навагрудскага ваяводства і павета Райцаўская вясковая гміна. Назва пайшла ад размяшчэння ў балоцістай мясцовасці.

**в.Рукаўчыцы.** У 1777 – 1799 гадах аколіца Рукаўчыцы ў складзе другога маёнтка Асташын. У XIX - пачатку XX стагоддзя аколіца Рукаўчыцы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе аколіца Рукаўчыцы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая

гміна. Паселішча належала арандатару Рукаўчыцкаму, а пасяленцы займаліся распрацоўкай торфу.

**в.Церавічы.** У 1888 годзе аколіца Церавічы ў Цырынскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Церавічы Навагрудскага ваяводства і павета Цырынская вясковая гміна. Першапасяленцы ваколіцы займаліся здабычай меду і штогод адзначалі свята Церэры. Праводзіліся свята ў красавіку і працягваліся восем дзён. У ахвяру прыносіліся мядовыя соты.

**Ярэміцскі сельсавет** [11. с.634-639]

**аг.Ярэмічы.** Паселішча Ярэмічы ўзгадваецца ў 1848 годзе ў кнізе "Вайскова-статыстычны агляд Расійскай імперыі". У XVII стагоддзі мястэчка Яромічы ў Наваградскім павеце ўпамінаецца ўпершыню як рачная прыстань на Нёмане. Яромічы былі заснаваны Ярмалаем. Ярмалай быў шурынам бацькі Канстанціна Раецкага (памешчыка), у якога граф К. Кашыц купіў маёнтак Вобрынь. Ярмалай першы выбраў месца для пабудовы вадзяной станцыі. Пазней тут вырасла невялікае пасялішча, якое было размешчана на беразе ракі і яго любімы шурын назваў Яромічы. Для зручнасці говару мясцовамі жыхарамі Яромічы былі пераіменаваны ў Ярэмічы. У XIX - пачатку XX стагоддзя мястэчка Ярэмічы цэнтр воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе мястэчка Ярэмічы цэнтр гміны Навагрудскага ваяводства і павета, а з 1926 года вёска Ярэмічы Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна.

**в.Антанёва.** Сяло Антанёва ў другой палавіне XIX стагоддзя ў Дзераўлянскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні. У 1923 годзе вёска Антанёва ў Валожынскім ваяводства і павеца Дзераўлянская вясковая гміна. У час вайны вёска поўнасцю спалена акупантамі, а ў пасляваенны час адноўлена і ўваходзіць у склад Мірскага, затым Карэліцкага раёнаў Баранавіцкай вобласці. Паселішча размешчана на былых уладаннях графа Антонава.

**в.Баўцічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Баўцічы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Баўцічы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. У XVIII стагоддзі на гэтым месцы была дрыгва ды невялікае паселішча, пасяленцы якога боўталіся ідучы па гэтаму бездарожжу і толькі ў XIX стагоддзі пасля асушэння пашырылася паселішча і адступіла забалочаннасць.

**в.Быковічы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Быковічы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Быковічы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назву надалі перасяленцы з цырынскага паселішча Быкевічы. Перасяліліся людзі і назву роднай вёскі ўзялі з сабой, толькі прыжылася як Быковічы.

**в.Воўчае.** Балота і фальварак Воўчае Балота ў 1923 годзе Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна. Назва гаворыць сама за сябе. У непраходнай для чалавека балоцістай мясцовасці вадзіліся ваўкі і іншыя звяры.

**в.Вялікая Вобрына**. Паселішча Вобрына ўзгадваецца ў 1767-1768 гадах у судовых дакументах Навагрудскага земскага суда, адносіцца да маёнтка Вобрынь. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Вялікая Вобрына і асада Лузінаўка ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Вялікая Вобрына Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва ад прозвішча харунжага Івана Вобрынскага, якому належала паселішча - першапачаткова Вобрынь, а пасля перасялення з хутароў, калі паселішча стала вялікім - дадалі Вялікая Вобрынь.

**в.Даўгінава.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Даўгінава і асада Дуброва ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923

годзе вёска Даўгінава Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Паселішча названа з-за таго, што было размешчана з аднаго боку дарогі па ўсёй даўжыні і называлі яго Даўгі, затым ўзнікла побач паселішча Новыя Даўгі і забудовы сталі па абодва бакі, а да паселішча прыжылася назва Даўгінава.

**в.Зарэчча.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Зарэчча ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Зарэчча Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Вёска, па іншы бок ракі, за ракой Уша .

**в.Лядкі.** Сяло Лядкі Турэцкага графства Навагрудскага павета. Прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У 1777 годзе сяло Лядкі ўваходзіла ў фальварак Пузяневічы. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Лядкі ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Лядкі Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Паселішча размешчана на ўзвышшы паміж рэкамі Нёман і Сэрвач, адкрыта халодным як лёд вятрам. Пасяленцы так і гаварылі па восені "падзьмулі лядкі трэба цяплей апранацца", адсюль і назва.

**в.Малая Вобрына.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло, фальварак і асада млыновая Вобрынь, фальваркі Роскаш і Стракоць ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Малая Вобрына Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Размешчана паселішча побач з паселішчам Вялікая Вобрына, але прыжылася назва як Малая Вобрына.

**в.Новае Сяло.** Новае і Старое Сяло фальварка Пузяневічы, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX -

пачатку XX стагоддзя Новае і Старое Сяло (да 60-х гадоў XIX стагоддзя) ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Нрвае Сяло Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Пасля правядзення зямельнай рэформы ў ВКЛ у XVI стагоддзі ўтварылася паселішча першапачаткова называлі як Новае Сяло, пазней яно было падзелена на Новае і Старое Сяло. У час вайны было спалена і пасля аднаўлення паселішча назвалі Новае Сяло.

**в.Пасёлак Першамайскі.** Як маёнтак Вобрынь у Навагрудскім павеце ўзгадваецца ў 1767-1768 гадах у судовых дакументах Навагрудскага земскага суда. У XIX - пачатку XX стагоддзя маёнтак (да маёнтка адносіліся сёлы Вялікая і Малая Вобрына) ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Пасёлак Першамайскі Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. У пачатку XX стагоддзя назва Пасёлак Першамайскі пайшла ад рэвалюцыйнай настроеннасці жыхароў. У маёнтку ў тыя гады дзейнічаў забастовачны камітэт.

**в.Пагарэлка.** Сяло Пагарэлка Навагрудскага павета , прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Пагарэлка ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Пагарэлка Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. У пачатку XVI стагоддзя, калі Мір, Карэлічы і іх ваколіцы былі разрабаваны татарамі. Частка пагарэльцаў знайшлі прытулак у Налібоцкай пушчы і пачалі ўладкоўваць сваё жыллё. Ад гэтага і паселішча пагарэльцаў назвалі Пагарэлкай. У Вялікую Айчынную вайну ў жніўні 1943 года вёска была спаленая цалкам, пасля адбудовы - назва засталася.

**в.Рудзьма.** У канцы XIX стагоддзя фальварак Рудзьма Дзераўнянскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні. У 1923 годзе вёска Рудзьма Валожынскага ваяводства і павета Дзераўлянская вясковая гміна. З 1940 года ўваходзіць у склад Мірскага затым Карэліцкага раёнаў Баранавіцкай вобласці. Назва ад размяшчэння каля Рудзьмянскага канала, а канал пракапаны па праекту інжынера па прозвішчу Рудзік.

**в.Сіняўская Слабада.** Сяло Наднёманская Слабада (Слабада Радзівілаўская) Мінскага павета, прыкладная храналогія ўтварэння і станаўлення XVII стагоддзе. У канцы XIX стагоддзя сяло Сіняўская Слабада Дзераўнянскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні. У 1923 годзе вёска Сіняўская Слабада Валожынскага ваяводства і павета Дзераўлянская вясковая гміна. З 1940 года ўваходзіць у склад Мірскага затым Карэліцкага раёнаў Баранавіцкай вобласці. Сяляне, якія атрымалі свабоду "вольную" ад Радзівіла пасяліліся за ракой Нёман, а паселішча назвалі Наднёманская Слабада (Слабада Радзівілаўская), а ў канцы XIX стагоддзя назвалі “сіняўскай” ад сініх туманаў над Нёманам.

**в.Скорычы.** У XIX - пачатку XX стагоддзя сяло Скорычы ў Ярэміцкай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. У 1923 годзе вёска Скорычы Навагрудскага ваяводства і павета Ярэміцкая вясковая гміна, а з 1926 года Навагрудскага ваяводства Стаўбцоўскага павета Турэцкая вясковая гміна. Назва ад прозвішча арандатара Скорыцкі, а ў народзе яго звалі Скорыч. За паселішчам так і замацавалася гэта назва.

**х.Чорная.** У канцы XIX стагоддзя хутар Чорная ў Дзераўнянскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні. У 1923 годзе хутар Чорная Валожынскага ваяводства і павета Дзераўлянская вясковая гміна. З 1940 года ўваходзіць у склад Мірскага затым Карэліцкага раёнаў Баранавіцкай вобласці. Назва ад размяшчэння каля ракі Чорная, а рака працякае па тарфяніку, таму і “чорная”.

## Пераселеныя хутара.

**Райцаўскі сельсавет.** х.Вайракі між вёсак Валокі – Шчонаво; х.Плітніца між вёсак Забердава - Русацін – Мірацічы; х.Абясінія каля вёскі Плужыны; х.Грабаўка за вёскай Сегда; х.Гара між вёсак Забердава - Лукашын.

**Варанчанскі сельсавет.** х.Марыны між вёсак Салянікі - Цянявічы.

**Лукскі сельсавет.** х.Пятрацкевічы і х.Ваўчак між вёсак Лукі – Вышкава; х.Кулакоўшчына, Ксёндзаўшчына, Малявка каля вёскі Далматаўшчына.

**Малюшыцкі сельсавет.** х.Дубнякі, Грэнава між весак Малюшычы – Скорава; хутар Манастыр між вёсак Савашы - Аколіца.

**Турэцкі сельсавет.** х.Некрашава каля вескі Некрашэвічы.

**Красненскі сельсавет.** х.Мянюцічы паміж вёсак Працяневічы - Малыя Тупалы.

## Урочышчы.

**Мірскі сельсавет.** Урочышчы: "Трэцяе поле" па левы бок ад дарогі Пясочная - Стаўбцы. Перад ім яшчэ два, але без назвы. "Азёршчына" - каля вёскі Возерскае. Лясны балоцісты масіў з азярынамі, геалагічны помнік прыроды. "Чорная Горка"  - злева па дарозе з Міра на Стоўбцы. Цяністы цёмны лес, ні грыбоў, ні ягад. "Барысаў Луг"- па гэтай жа дарозе. Калісьці непадалёку стаяў хутар Барыса і яму належаў гэты луг, размешчаны сярод поля. "Калоднае" - каля вёскі Беражна. Там пасля зімы хутка расцвіталі першацветы, туды вывозіліся калоды з пчоламі і соты хутка напаўняліся мёдам. "Кляйманты"  - лясіста-багністы масіў насупраць вёскі Студзёнка. Назва паходзіць ад прозвішча немца-арандатара Кляймант.  "Берштаны" - лясны масіў каля вёскі Прылукі. Назва таксама паходзіць ад прозвішча немца-арандатара Берштан.

**Жухавіцкі сельсавет.** Урочышчы: "Глушаць" паміж вёсак Хлюпічы - Малыя Жухавічы. Як зойдзеш у нізіну абапал нічога не бачна, глуш як мае

быць, а навокал поле да самага гарызонту. “Серамоўшчына” - між вёсак Малыя Жухавічы і Юравічы. Балоцістая мясціна шэрая ад туманаў і ні гуку адтуль. “Зарэчча” - каля вёскі Кожава. Тэрыторыя сенажаці за ракой Уша. “Агніва” - каля вёскі Радунь. Нізіна, камяністая мясцовасць, дзе шмат каменя крэменю. Крэмень (агністы камень) прыродны мінерал крышталічнага і аморфнага кремнезёма ў даўніну выкарыстоўваўся для здабычы агню.

**Лукскі сельсавет.** Урочышчы: “Ханькаўка” - каля вёскі Крышылоўшчына. Зямельныя надзелы гаспадара па прозвішчы Ханька. “Глінішча” - каля гэтай жа вёскі. Глiністая глеба, месца выхаду гліны на паверхню. Гліняныя кар'еры, дзе гліну здабываюць для выпрацоўкі цэглы на будаўніцтва і на гаспадарчыя патрэбы. “Будзішча” - паміж вёсак Крышылоўшчына – Кожава. Праводзіліся распрацоўкі торфу на паліва, каб не хадзіць туды і назад пабудавалі маленькія домікі (будкі) у якіх часова жылі работнікі, вось і называлі гэта месца будзішчам. “Кузяўкі” - паміж вёсак Лукі - Асташын. Куды ні ступі адны кузяўкі. Шмат саранчы было чамусьці ў тым месцы. “Саковічы” - паміж вёсак Вышкава і Баяры. Вакол поля бярозавыя лясы, ў якіх па вясне дабывалі бярозавы сок. “Залужжа” - каля вёскі Лукі. Спачатку тры лужка і за імі залужжа сенажаць гаспадара Ханька. “Рэзы” - каля гэтай жа вёскі. Сёння едзем касіць на “рэзы”. Адмераныя (нарэзаныя) дзялянкі сенакосу. “Маргі” - каля гэтай жа вёскі. Сёння едзем працаваць у “маргі”. Морг азначаў плошчу, якую адзін чалавек можа ўзараць або скасіць на адной касілцы запрэжанай канём на працягу працоўнага дня (зранку да паўдня), велічыня вагалася ад 0,33 да 1,07 гектара - у залежнасці ад якасці глебы, запрэжаных коней і інструментаў. Урочышчы “Рэзы” і “Маргі” падзяляе “Лінзін роў”. Быў памочнікам кіраўніка маёнтка Цетра чалавек ад якога нічога не схаваеш, усё ўбачыць і даложыць, ды яшчэ і сам прыдумае, як яму больш выгадна. Прыгонныя сяляне далі яму мянушку "лінза". Знайшлі яго цела ў лагчыне і празвалі яе "лінзін роў". “Тычыніца” - каля вёскі Асташын. Гарыстая і лясістая мясцовасць дзе рос арэшнік. Там і тычачкі на фасолю, каб лепш завіваліся нарыхтаваць можна было.

**Райцаўскі сельсавет.** Урочышчы: “Панцялееўка”- паміж вёскамі Зялянец і Сёгда. Калісьці ў полі быў хутар гаспадара Панцялея. “Ленкава” - каля вёскі Забердава. Травяністы масіў, на якім вельмі добра пасля засцілу вылежваўся лён. “Корзнаўка” - каля гэтай жа вёскі. У часы германскай акупацыі поле і лес былі дадзены ў арэнду нямецкаму памешчыку Корзану. Корзанаўка, а затым для зручнасці Корзнаўка, празвалі жыхары лясны масіў, а за гэтым лесам паля, як бы пліты размешчаны, празвалі ў народзе мясцовасць “Плітніцай”. "Бабья даліна", справа па дарозе, не даязджаючы вёскі Райца, у лясным масіве. Ў даліне любілі праводзіць вольны час манашкі-палатынкі, якія жылі непадалёк, у былым панскім доме. Прыезджая шляхта, убачыўшы іх у даліне, казала, “пол. zobacz babia dolina” (глядзіце "бабья даліна"), вось і прыжылося да гэтага часу.

**Варанчанскі сельсавет.** Урочышчы: “Зараснікі” - каля вёскі Горбатавічі. Проста заросшая лазняком балоцістая мясцовасць. “Маглі”- каля вёскі Труднава. Трудна апрацоўваць там зямлю, не ўсе гаспадары маглі гэта і апрацоўвалі толькі тыя, хто меў плуг ды пару добрых коней. “Варанчанскі Лес” - паміж вёсак Варонча і Дуброва. Адпавядае назве вёскі. “Дарагоўскі Лес” - паміж вёсак Варонча - Бабонеўка. Адпавядае назве вёскі Дорагава, якая знаходзіцца збоку.

**Малюшыцкі сельсавет.** Урочышчы: “Дубняк” - каля вёскі Сапатніца. Лес, пераважна дубовы. “Баршчоўка” - каля вёскі Яруга. Раней там былі хутары і некалькі гаспадароў мелі прозвішча Баршчоў. Цяпер лес ды поле. “Закачанава” - каля гэтай жа вёскі. Гарыстае поле, гара за гарою, закачае, калі пахадзіць. “Вярблюжыя Горы” - каля вёскі Сапатніца. Вялікія горы, то гара ўніз, то зноў гара. Перакаты як гарбы ў вярблюда. “Кручоўка” паміж вёсак Баранавічы – Руднікі. Даволі высокія і крутыя горы. З самай высокай гары ў ясную пагоду бачна царква ў вёсцы Валеўка Навагрудскага раёна. “Гай” - каля вёскі Малыя Туполы. Прыгожы бярозавы лес адпавядае назве. “Чарнішча” - паміж вёскамі Палужжа - Равіны. Добры чарназём, зямля аж чорная, казалі раней. “Замкі” - каля вёскі Горныя Руткавічы. На полі ў

канцы ляснога масіва дзве гары як замкі, а побач глыбокі яр. “Быкава” - каля гэтай жа вёскі. Раней там быў хутар гаспадара па прозвішчу Быкаў. “Міжрэчча” - каля пасёлка Людвікі. Сянажаць між рэк Рута і Сэрвач.

**Красненскі сельсавет.** Урочышчы: “Калінаўнік” - каля вёскі Камаровічы. Гарыстая лясная мясцовасць сярод поля, дзе расце шмат каліны. Ідзём у “калінаўнік” па каліну на зіму нарыхтаваць. Калі пралі лён уручную елі жанчыны каліну, каб вылучалася больш сліны. “Дадаткі Запольскія” - каля вёскі Жукі. Падчас польскай акупацыі дзялілі зямлю на валокі і калі не атрымліваўся поўны надзел, дадавалі ў дадатках. “Лозы Вастухоўскія” - каля вёскі Востухава. Ў гэтым урочышчы толькі лаза расце добрая, каб плесці кошыкі. Вось і хадзілі па яе ў “лозы Вастухоўскія” з усіх навакольных вёсак. Цяпер, пасля меліярацыі там сенажаць. “Гай” - паміж вёскамі Амневічы і Малыя Тупалы. Назва адпавядае лясному масіву. “Заалешша” - каля вёскі Навашыно. Каля вёскі былі зараснікі алешыны, а затым ворныя землі, вось і празвалі заалешша. “Бераг” - ад вёскі Краснае і да берага ракі Сэрвач. Сенажаці там, вось і гаварылі, пойдзем сенаваць на бераг.

**Цырынскі сельсавет.** Урочышча “Прыдаткі” - паміж вёсак Застадолле і Баяры. Невялікае поле, як бы прыдадзена да чаго вялікага.

**Ярэміцкі сельсавет.** Урочышчы: “Графская Пушча” - каля вёскі Антанёва. Пачатак Налібоцкай пушчы, заказнік мясцовага значэння. Любімае месца палявання тытулаваных асоб Мірскага графства. “Махначава” - каля гэтай жа вёскі. Пачатак Налібоцкай пушчы, у гэтым месцы рос вельмі якасны мох для будаўніцтва драўляных пабудоў. Пойдзем у “Махначава” нарыхтоўваць мох, лепшага месца не знайсці. “Беразнянка” - каля вёскі Сіняўская Слабада. Пачатак Налібоцкай пушчы, бярозавы лес вакол. Пойдзем у “Беразянку” на нарыхтоўку бярозавага соку. “Забабкава” - між вёсак Новае Сяло - Сіняўская Слабада. Хутар Бабкава ў старыну быў і жылі ў ім толькі жанчыны, якія збіралі травы лекавыя, ягады ды грыбы. Месца балоцістае, жыўнасці не трымалі і агароды не апрацоўвалі. У ежу ўжывалі толькі прыроднае. “Лазінаўка” - за ракой Уша на ўзбярэжжы ракі Нёман.

Лазінаўка, месца паросла лазой. З цягам часу пачалі называць “Лузінаўка” для зручнасці. “Гактары” - за ракой Уша насупраць вёскі Вялікая Вобрына. Асушаная багністая мясцовасць, шмат прастакутных сенакосаў па гектару, падзеленых паміж сабой каналамі. “Воўчае Балота” каля вёскі Зарэчча. Багністая мясцовасць чалавеку прайсці немагчыма, а зверу толькі там і хавацца. “Руднянскі Лес” - каля вёскі Рудзьма. Пачатак Налібоцкай пушчы, адпавядае назвё вёскі. “Гарнізоны” каля гэтай жа вёскі. Багністая мясцовасць прайсці мог толькі дасведчаны сцежкі чалавек. Там былі партызанскія зямлянкі. “Лугі” - каля гэтай жа вёскі. Прынёманскія заліўныя лугі. Падсушыла, сёння касіць ідзём на “лугі”. “Агнішча” - каля вёскі Пагарэлка. Самае высокае ўзвышша ў нізіне ля Нёмана. На Купалу там вогнішча і гульні праводзілі. “Касавец” - паміж ракой Чорная і Рудзьмянскім каналам. Лугавая мясцовасць, сенажаць, вельмі якаснае сена. Сёння касіць ідзём, у касаўцы трава ў пояс.

**Заўвага:** Паходжанне назваў вёсак, хутароў, рэк і ўрочышчаў раёна запісана з успамінаў састарэлых жыхароў у 80 - 90 гады XX стагоддзя.

ВЕТЭРАН ПРАЦЫ, КРАЯЗНАВЕЦ
Б.К. НАВІЦКІ (КАРЭЛІЧЫ)

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Рака** - прыродны водны паток (вадаток), бягучы ў выпрацаваным ім паглыбленні (пастаянна натуральным рэчышчы), які сілкуецца за кошт паверхневага і падземнага сцеку з яго басейна.

**Мястэчка** - ўтваралася пры ўзвядзенні замкаў (Мір), пры гасцінцах (Карэлічы). Пасля далучэння да Расійскай імперыі сталі цэнтрамі валасцей. У адрозненне ад вёсак яны вылучаліся гандлем і рамяством, як асноўнымі заняткамі большай часці жыхароў, мелі большую складанасць планавання, забудовы і абавязкова гандлёвы пляц. У канцы 1930 года тэрмін “мястэчка” перастаў існаваць юрыдычна і яны перайшлі ў разрад вёсак.

**Аграгарадок**(аг.) - адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, добраўпарадкаваны населены пункт у сельскай мясцовасці, у якім створана вытворчая і сацыяльная інфраструктура для забеспячэння сацыяльных стандартаў насельніцтва.

**Вёска**(в.) - паселішча з некалькамі дзесяткамі альбо сотнямі хат індывідуальнага збудавання, з цягам часу можа быць пераўтворана ў сяло. Асноўнае адрозненне ў тым, што ў сяле павінна быць царква, аднак гэта не з`яўлялася агульным правілам. Узніклі ў XVI стагоддзі пасля рэформы і ўстановы адзінкі феадальнай павіннасці “валока” замест ранейшых двара ці некалькі двароў.

**Сяло**(с.) - тып буйнага сельскага пасялення, часцей за ўсё цэнтр воласці дзе мелася царква, або касцёл, а пазней і абавязкова наяўнасць абшарніцкага маёнтку. Узніклі ў XVI - XVII стагоддзях ў сувязі з запрыгоньваннем сельскай абшчыны. Пасля далучэння да Расійскай імперыі, сёлы, як правіла, становяцца цэнтрамі валасцей у складзе паветаў. У XIX стагоддзі абавязковым атрыбутам сяла сталі царква, або касцёл, вучэльня і валаснае праўленне, а ў XX стагоддзі сёлы сталі цэнтрамі сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў і атрымалі статус вёскі.

**Фальварак** - невялікае паселішча ў адзін ці пяць двароў, адмысловая феадальная гаспадарка, спецыялізаваная выключна на вытворчасць збожжа

на продаж. Паводле характару і структуры забудовы фальварка адпавядалі абшарніцкім маёнткам, ці заможным шляхецкім засценкам. Фальваркам часам называлі вёску на зямлі арандатара. Узніклі ў канцы XV і на пачатку XVI стагоддзяў і праіснавалі на цяперашняй тэрыторыі раёна да канца 30-х гадоў XX стагоддзя.

**Маёнтак** - агульная назва землеўладання з панскай гаспадаркай жылымі і гаспадарчымі будынкамі, прадпрыемствамі і г.д. пры феадальным і капіталістычным развіцці. Маёнткі здаваліся арандатарам, якія абавязваліся плаціць пэўны падатак. Узніклі ў XVI стагоддзі і праіснавалі да аб`яднання з БССР.

**Засценак** - невялікае сялянскае аднадворнае пасяленне, аналагічнае заможнаму дворышчу. Узніклі пасля рэформы 1557 года, вядомай як “устава на валокі”. Пасля перамеру зямлі, засталіся адзінкі зямлі “за мяжою” ці “за сцяною”, якія знаходзіліся ў канцы поля і перадаваліся дробнай шляхце. Узніклі ў XVI - XX стагоддзях і праіснавалі да 1940 года.

**Ляснічоўка** - хата лясніка і яго сям'і ў лесе, ці каля яго.

**Асада і Асада млыновая** - на землі адабраныя ў сялян у перыяд польскай акупацыі сялілі каланістаў-асаднікаў і іх паселішчы называлі асадай.

**Аколіца** - паселішча дробнай шляхты, якая ссялялася асобна ад сялян-вяскоўцаў.

**Калонія** - участак паміж польскімі дамамі заняты пазнейшымі пабудовамі.

**Хутар**(х.) - як від аднадворнага паселішча, ўзнік дзякуючы апрацоўцы новай зямлі калі стваралася адасобленая гаспадарка з размяшчэннем усіх гаспадарскіх збудаванняў у адным месцы побач з зямельным надзелам. Утварэнне хутароў пачынаецца з адмены прыгоннага права ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Перасяленне сялян з хутароў адбылося пасля вайны.

**Урочышча** - любая частка мясцовасці, якая адрозніваецца ад астатніх участкаў навакольнай мясцовасці. Лясны масіў сярод поля, балота ці нешта падобнае, а таксама ўчастак мясцовасці, якая з'яўляецца натуральнай мяжой між чым-небудзь.

**Выкарыстаная літаратура:**


1. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Т.16. / рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Минск. : Бел.Эн., 2003.

2. Блакітная кніга Беларусі : энцыкл. / рэд. Н.А. Дзісько [і інш.]. — Минск. : Бел.Эн,1994. — 415 с.

3. Вялікае Княства Літоўскае: энцыкл. : у 3 т. / рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Минск. : БелЭн., 2005.

4. Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX стагоддзя ў дакументах і матэрыялах : хрэстаматыя / рэд. А.Ф. Сталярчук. — Вільня : ЕГУ, 2007. – 302 с.

5. Жучкевіч В.А. Паходжанне геаграфічных назваў (тапаніміка) Беларусі. — Мн. : БДУ,1961.

6. Кароткі тапанамічны слоўнік Беларусі / В.А. Жучкевіч. — Мн. : БДУ, 1974. — 280 с.

7. Круталевіч В.А. Рэспубліка Беларусь : адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. — Мн. : Навука і тэхніка, 1966.

8. Матэрыялы раянавання Заходніх абласцей Беларускай ССР. ЦК КП(б)Б. — Мн. : Выдавецтва ЦК КП(б)Б,1940.

9. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII - перш. пал. XIX ст. / І. Сарокіна. — Вільня : ЕГУ, 2010.

10. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Гродзенская вобласць : нармат. давед. / І.А. Гапоненка [і інш.] ; пад. рэд. В.П. Лемцюговай. — Мн. : Тэхналогія, 2004. – 469 с.

11. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Карэліцкага раёна. – Мн. : Ураджай, 2000.

12. Прырода Беларусі : папул.энцыкл / рэд. І.П. Шамякін і інш.- Мн. : БелСЭ, 1986. – 599 с.

13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.].- Мн. : Бел.Эн., 1993-2003.

14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 4 т. /Рэд. Б.І. Сачанка і інш.- Мн. : Бел.Эн., 1994.

15. Геаграфічныя карты:

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі 1793-1796 гг.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі 1921-1926 гг.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі 1931-1939 гг.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Савецкай Беларусі 1935-1937 гг.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі 1945 года

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі першая палавіна XIX стагоддзя

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі другой палаве XIX - пачатку XX ст.

Карта Слонімскага намесніцтва падзеленага на восем паветаў у 1796 годзе.

Карта губерній Беларусі і Літвы 1802 года.

Карта Гродзенскай губерні 1802 года.

Карта Карэліцкага рэгіёну 1915 года.

Карты Беларусі 1917 г., 1917-1918 гг., 1918-1919 гг., 1919 г.